*144. НОВА-БАРЫСАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—г. Нова-Барысаў.*

**Заходняя частка Н. Барысава ў граніцах—па вуліцах:** 8-га сакавіка, Максіма Горкага, Леніна, Чырвонасцяжная, Шкляная, Праспект Рэволюцыі, Праспект Орджанікідзе, Набережная і Перасадскі сельсовет Барыскаўскага раёна.

*145. БАРЫСАЎСКАЯ ЧЫГУНАЧНАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—г. Нова-Барысаў, клуб «Камінтэрн»).*

**Усходняя частка Н. Барысава ў граніцах—па вуліцах:** 8-га сакавіка, Максіма Горкага, Леніна, Чырвонасцяжная, Шкляная, Праспект Рэволюцыі, Праспект Орджанікідзе, Набережная і В. Стахаўскі сельсовет Барысаўскага раёна.

*146. ЛАГОЙСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Лагойск).*

**Сельсоветы:** Лагойскі, Падонкаўскі, Юркавіцкі, Швабскі, Астрашыцкі і Кузевіцкі Лагойскага раёна.

*147. ГАЕНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—в. Гайна).*

**Сельсоветы:** Гаенскі, Слабодскі, Кораньскі, Янушкаўскі, Калачоўскі, Бесядскі, Прудзішчанскі і Беларуцкі Лагойскага раёна.

*148. СМАЛЯВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Смалявічы).*

**Смалявіцкі местачковы совет і сельсоветы:** Емельянаўскі, Прылепскі, Юраўскі і Жажэлкаўскі Смалявіцкага раёна.

*149. ПЛІСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — торфзавод «Чырвоны сцяг»).*

**Сельсоветы:** Жодзінскі, Плісві, Верхменскі, Кленікскі і Варотаўскі Смалявіцкага раёна.

*150. СМАЛЯВІЦКАЯ ОРДЖАНІКІДЗЕЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—торфзавод імя Орджанікідзе).*

**Сельсоветы:** Забалоцкі, Слабодскі, Драчкаўскі, Пятровіцкі Смалявіцкага раёна і Грыбенскі Чэрвеньскага раёна.

*151. ЗАСЛАЎСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Заслаўль).*

**Сельсоветы:** Шаршунскі, Шэпелеўскі, Рогаўскі, Гатовінскі, Сёмкава-Гарадзецкі, Слабодскі і Анусінскі Заслаўскага раёна.

*152. ЗАСЛАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Заслаўль).*

**Сельсоветы:** Заслаўскі, Трэскоўшчынскі, Старасельскі, Нарэйкаўскі, Путчынскі, Сталінскі, Новасадскі і Новадворскі Заслаўскага раёна.

*153. ГАРАДЗЕЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — в. Астрашыцкі Гарадок).*

**Сельсоветы:** Астрашыцка-Гарадзецкі, Папернянскі, Бараўскі, Ратамскі, Прыгарадны (частка) Менскага раёна.

*154. КАЛОДЗІШЧАНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — ст. Калодзішчы).*

**Сельсоветы:** Калодзішчанскі, Трасцянецкі і Замастоцкі Менскага раёна.

*155. МЕНСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Менск).*

**Сельсоветы:** Прыгарадны (частка), Гатаўскі, Абчацкі, Каралішчанскі, Нова-Дворскі, Сеніцкі і Строчыцкі Менскага раёна.

*156. САМАХВАЛАВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Самахвалавічы).*

**Сельсоветы:** Самахвалавіцкі, Падгайскі, Рубілкаўскі, Кайкаўскі, Крупіцкі Менскага раёна і Дудзіцкі Рудзенскага раёна.

*157. СТАНЬКАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—в. Станькава).*

**Сельсоветы:** Станькаўскі, Дабрынёўскі, Фаніпальскі, Грычанскі, Байдацкі і Ляхавіцкі Менскага раёна.

*158. ДЗЯРЖЫНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Дзяржынск).*

**Горад Дзяржынск і сельсоветы:** Новасёлкаўскі, Старынкаўскі, Бараўскі II, Паланевіцкі і Негарэльскі Менскага раёна.

*159. МЕНСКАЯ ДЗІМІТРАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Менск, бібліятэка імя Перэца).*

**У граніцах — па вуліцах:** Танкавая, Ратамская, Рэспубліканская, Немігская, Калініна, Стара-Мясніцкая, Падзамкавая, рака Свіслач.

*160. МЕНСКАЯ КАЛІНІНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Менск, кантора Торфпрамсаюза).*

**У граніцах — па вуліцах:** Куйбышэва, Старажоўскі тупік, Красная, Чырвонасцяжная, II Чырвонасцяжны зав., рака Свіслач.

*161. МЕНСКАЯ МОЛАТАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Менск, памяшканне інтэрната Медінстытута па вуліцы Пушкіна).*

**У граніцах — па вуліцах:** Падлесная, Пушкіна, Басейная, Добралюбава.

*162. МЕНСКАЯ ВАРАШЫЛАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр —г. Менск, бібліятэка імя Дзем'яна Беднага).*

**У граніцах — па вуліцах:** Пушкіна, Падлесная, Маляўшчынская, Слепянская, Совецкая, зав. Луначарскага, Комуністычная, Таварыскі зав. да ракі Свіслач, рака Свіслач, II Чырвонасцяжны зав., Чырвонасцяжная, Красная, Старажоўскі тупік, Куйбышэва.

*163. МЕНСКАЯ ЛЕНІНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—г. Менск, Дом профсаюзаў).*

**У граніцах — па вуліцах:** Падзамкавая, Стара-Мясніцкая, Калініна, Немігская, Рэспубліканская, Урыцкага, Совецкая, зав. Луначарскага, Комуністычная, Таварыскі зав., рака Свіслач.

*164. МЕНСКАЯ ГОРКАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Менск, памяшканне стадыёна «Харчавік»).*

**У граніцах — па вуліцах:** Маляўшчынская, Сляпянская, Совецкая, рака Свіслач, Першамайская, Чырвонаармейская, Гарбарная, Лодачная, рака Свіслач, Чырвонаармейская, лінія чыгункі.

*165. МЕНСКАЯ СТАЛІНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Менск, памяшканне парткурсаў ЦК КП(б)Б).*

**У граніцах — па вуліцах:** Совецкая, Свердлоўская, Мічурына, Ульянаўская, Ульянаўскі зав., Круглы зав., Беларуская, Гарбарная, Чырвонаармейская, Першамайская, рака Свіслач.

*166. МЕНСКАЯ ПРАМЫСЛОВАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Менск, клуб Мясакамбіната).*

**У граніцах — па вуліцах:** фізкультурны зав., лінія чыгункі, Круглы зав., Беларуская, Гарбарная, Лодачная, рака Свіслач, Чырвонаармейская, лінія чыгункі, Палярная.

*167. МЕНСКАЯ КУЙБЫШЭЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Менск, 46-я школа).*

**У граніцах — па вуліцах:** Танкавая Ратамская, Рэспубліканская, Урыцкага, Совецкая, Берсона, Транспартны зав., Мэблевы зав.; Карла Лібкнехта.

*168. МЕНСКАЯ ДЗЯРЖЫНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Менск, памяшканне ЦК МОПР'а).*

**У граніцах — па вуліцах:** Карла Лібкнехта, Мэблевы зав., Транспартны зав., Берсона, Совецкая, Маскоўская, Суражская, Чыгуначная, III Чыгуначны зав., Парашутная.

*169. МЕНСКАЯ КАГАНОВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Менск, 9-я школа).*

**У граніцах — па вуліцах:** Красівая, Нова-Уфімская, лінія чыгункі, Маскоўская, Совецкая, Свердлоўская, Мічурына, Ульянаўская Ульянаўскі зав., лінія чыгункі.

*170. МЕНСКАЯ ЧЫГУНАЧНАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Менск, 18-я школа).*

**У граніцах — па вуліцах:** Парашутная, III Чыгуначны зав., Чыгуначная, лінія чыгункі, Нова-Уфімская, Красівая, лінія чыгункі.

*171. СМІЛАВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Смілавічы).*

**Смілавіцкі местачковы совет і сельсоветы:** Карзуноўскі, Галоцкі і Дукорскі Рудзенскага раёна.

*172. РУДЗЕНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—п. Рудзенск).*

**Сельсоветы:** Рудзенскі, Дрычанскі, Пяражырскі, Узлянскі, Азярычанскі і Цітвянскі Рудзенскага раёна.

*173. ЧЭРВЕНЬСКАЯ ГАРАДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Чэрвень).*

**Горад Чэрвень і сельсоветы:** Лядзенскі, Грэбянецкі, Горкаўскі, Кліноцкі і Валеватчэўскі Чэрвеньскага раёна.

*174. ЧЭРВЕНЬСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Чэрвень).*

**Сельсоветы:** Руднянскі, Дамовіцкі, Вайнілаўскі, Хутарскі і Калодзецкі Чэрвеньскага раёна.

*175. ГАРЭЛІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—в. Гарэлец).*

**Сельсоветы:** Задашчанскі, Слабодскі, Гарэліцкі, Сінчанскі, Варашылаўскі, Суцінскі Пухавіцкага раёна. Сяргеевіцкі і Шацкі Рудзенскага раёна.

*176. МАР'ІНАГОРСКАЯ -ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр —п. Мар'іна-Горка).*

**Сельсоветы:** Новасёлкаўскі, Блужскі, Талькаўскі і Блоньскі Пухавіцкага раёна.

*177. ПУХАВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Пухавічы).*

**Сельсоветы:** Пухавіцкі, Пудзіцка-Слабодскі, Турынскі і Балачанскі Пухавіцкага раёна.

*178. УЗДЗЕНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Узда).*

**Уздзенскі местачковы совет і сельсоветы:** Зенькаўскі, Каменскі, Сямёнавіцкі, Стальбоўшчынскі і Магільнянскі Уздзенскага раёна.

*179. ЛОШАНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Лоша).*

**Сельсоветы:** Лошанскі, Прысынкаўскі, Хатлянскі, Камяноцкі, Слабода-Пірашаўскі, Целякоўскі, Цеплянскі і Азерскі Уздзенскага раёна.

*180. КОПЫЛЬСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Копыль).*

**Сельсоветы:** Бабаўнянскі, Пацейкаўскі, Песачанскі, Вяліка-Раеўскі і Слабодакучынскі Копыльскага раёна.

*181. КОПЫЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Копыль).*

**Копыльскі местачковы совет і сельсоветы:** Велешынскі, Старыцкі, Стара-Копыльскі і Ванелевіцкі Копыльскага раёна.

*182. ЦІМКАВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Цімкавічы).*

**Цімкавіцкі местачковы совет і сельсоветы:** Быстрыцкі, Лешнянскі, Крывасёлкаўскі, Браткаўскі і Прускі Копыльскага раёна.

*183. ГРЭСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Грэск).*

**Сельсоветы:** Гацукоўскі, Палікараўскі, Селецкі, Першамайскі, Шышчыцкі, Грэскі, Покрашаўскі і Труханавіцкі Грэскага раёна.

*184. ГРОЗАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Грозава).*

**Грозаўскі местачковы совет і сельсоветы:** Мусіцкі, Грозаўскі, Пукаўскі Грэскага раёна, Сераднікоўскі і Ленінскі Слуцкага раёна.

*185. ЧЫРВОНАСЛАБОДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Чырвоная Слабада).*

**Чырвонаслабодскі местачковы совет і сельсоветы:** Смоліцкі, Семежаўскі, Макранскі, Замагільскі, Жываглодаўскі, Жыліхоўскі і Бучацінскі Чырвонаслабодскага раёна.

*186. ЧЫРВОНАСЛАБОДСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Чырвоная Слабада).*

**Сельсоветы:** Бялевіцкі, Малышэвіцкі, Старчыцкі, Чапліцкі, Чырвонаслабодскага раёна, Окцябрскі Слуцкага раёна і Чэпялеўскі Старобінскага раёна.

*187. СЛУЦКАЯ КІРАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—г. Слуцк)*

**Сельсоветы:** Серажскі, Івана-Агародніцкі, Беліцкі, Кіраўскі, Ісерпскі, Лучнікоўскі і Вяліка-Сліўскі Слуцкага раёна.

*188. СЛУЦКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—г. Слуцк).*

**Сельсоветы:** Бокшыцкі, Прошчыцкі, Мелешкаўскі, Урэчскі і Дарасінскі Слуцкага раёна.

*189. СЛУЦКАЯ ПРОЛЕТАРСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Слуцк, памяшканне Педвучылішча).*

**У граніцах — па вуліцах:** Окцябрская, Пролетарская, Валадарскага, 3-я Трудавая, 1-га Мая, Красная.

*190. СЛУЦКАЯ КОМСАМОЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Слуцк, памяшканне райсовета фізкультуры).*

**Паўночна-ўсходняя частка горада Слуцка ў граніцах — па вуліцах:** Окцябрская, Пролетарская, Валадарскага, 3-я Трудавая, 1-га Мая, Красная і Казловіцкі сельсовет Слуцкага раёна.

*191. СТАРА-ДАРОЖСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Старыя Дарогі).*

**Стара-Дарожскі местачковы совет і сельсоветы:** Стара-Дарожскі, Кармазаўскі, Пасекскі і Крываносаўскі Стара-Дарожскага раёна.

*192. ДАРАГАНАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Старыя Дарогі).*

**Сельсоветы:** Дараганаўскі, Нова-Дарожскі, Крынкаўскі, Жыцінскі і Шчыткаўскі Стара-Дарожскага раёна.

*193. ГОРКАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Старыя Дарогі).*

**Сельсоветы:** Дражненскі, Горкаўскі, Языльскі Стара-Дарожскага раёна, Сарагоўскі, Амговіцкі і Стараўскі Слуцкага раёна.

*194. ЛЮБАНЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Любань).*

**Любаньскі местачковы совет і сельсоветы:** Слабодскі, Тальскі, Юшкаўскі, Асавецкі, Яменскі і Рэдкавіцкі Любаньскага раёна.

*195. НЕЖЫНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — калгас «БВО»).*

**Сельсоветы:** Нежынскі, Рэчанскі, Турокскі, Мала-Гарадзячыцкі і Загальскі Любаньскага раёна.

*196. СТАРОБІНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Старобін).*

**Сельсоветы:** Старобінскі, Капацэвіцкі, Лістападавіцкі, Чыжэвіцкі, Чырвонадворскі і Мецэвіцкі Старобінскага раёна.

*197. СТАРОБІНСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Старобін).*

**Сельсоветы:** Пагосцкі, Зажэвіцкі, Сухамільскі, Долгаўскі, Мазурскі, Даманавіцкі і Чырвоназерскі Старобінскага раёна.

## ПАЛЕСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

*198. ГЛУСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Глуск).*

**Сельсоветы:** Сімановіцкі, Гарадкоўскі, Жолвінецкі, Макавіцкі, Хваставіцкі, Дакольскі і Глускі Глускага раёна.

*199. ОКЦЯБРСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Глуск).*

**Сельсоветы:** Каткаўскі, Слаўкавіцкі, Ляскавіцкі, Клетнянскі, Парэцкі, Окцябрскі і Гацкі Глускага раёна.

*200. ОЗЕМЛЯНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—в. Оземля).*

**Сельсоветы:** Оземлянскі, Бярозаўскі, Перакальскі, Казловіцкі Глускага раёна, Коўчыцкі, Пратасаўскі, Раманавіцкі, Любанцкі і Гарохавіцкі Парыцкага раёна.

*201. ПАРЫЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Парычы).*

**Парыцкі местачковы совет і сельсоветы:** Казлоўскі, Дабравольшчанскі, Шчадрынскі, Шчадрынскі нацсовет, Стэпскі і Каралева-Слабодскі Парыцкага раёна.

*202. ШАЦІЛАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Парычы).*

**Сельсоветы:** Шацілаўскі, Чыркавіцкі, Дуброўскі, Ракшынскі і Чэрнінскі Парыцкага раёна.

*203. ДАМАНАВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — в. Даманавічы).*

**Сельсоветы:** Даманавіцкі, Навасёлкаўскі, Ліпаўскі, Асташкавіцкі Даманавіцкага раёна і Баравікоўскі Парыцкага раёна.

*204. АЗАРЫЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Азарычы).*

**Сельсоветы:** Азарыцкі, Валасовіцкі, Давыдаўскі, Халмянскі, Кабыльшчанскі, Круковіцкі, Хоміцкі і Мартынавіцкі Даманавіцкага раёна.

*205. НОВАСЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Капаткевічы).*

**Сельсоветы:** Колкаўскі, Веліка-Лучыцкі, Новасёлкаўскі, Кашэвіцкі, Капаткевіцкага раёна, Ламавіцкі, Савіцкі і Капліцкі Даманавіцкага раёна.

*206. КАПАТКЕВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Капаткевічы).*

**Капаткевіцкі местачковы совет і сельсоветы:** Капаткевіцкі, Пціцкі, Бяседскі, Цярабоўскі, і Чэлюшчавіцкі Капаткевіцкага раёна.

*207. КАМАРОВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—в. Камаровічы).*

**Сельсоветы:** Чырвонаслабодскі, Камаровіцкі, Бобрыцкі, Нова-Галоўчыцкі Капаткевіцкага раёна, Грабоўскі Петрыкаўскага раёна, Дзяковіцкі, Ветчынскі і Ляхавіцкі Жыткавіцкага раёна.

*208. КАПЦЭВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — п. Капцэвічы).*

**Сельсоветы:** Капцэвіцкі, Брынёўскі Ляскавіцкі, Макарыцкі, Курычыцкі і Бабуніцкі Петрыкаўскага раёна.

*209. ПЕТРЫКАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—г. Петрыкаў).*

**Горад Петрыкаў і сельсоветы:** Скрыгалаўскі, Белкаўскі, Сметаніцкі і Канковіцкі Петрыкаўскага раёна.

*210. ЖЫТКАВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Жыткавічы).*

**Жыткавіцкі местачковы совет і сельсоветы:** Юркевіцкі, Браніслаўскі, Людзеневіцкі, Руднянскі, Белеўскі і Жыткавіцкі Жыткавіцкага раёна.

*211. ТУРАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Тураў).*

**Сельсоветы:** Азеранскі, Пераро̆ўскі, Верасніцкі, Запясоцкі, Рычоўскі і Тураўскі Тураўскага раёна.

*212. ЛЕЛЬЧЫЦКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Лельчыцы).*

**Сельсоветы:** Лельчыцкі, Бараўскі, Мілашэвіцкі, Глушкавіцкі, Сімоніцкі Лельчыцкага раёна, Дзержынскі, Букчанскі і Тонежскі Тураўскага раёна.

*213. ЛЕЛЬЧЫЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Лельчыцы).*

**Лельчыцкі местачковы совет і сельсоветы:** Стадоліцкі, Грэбенеўскі, Сініцка-Польскі, Картыніцкі Лельчыцкага раёна, Стара-Высоцкі, Кармянскі, Скараднянскі і Зосінцаўскі Ельскага раёна.

*214. БУЙНОВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — в. Буйновічы).*

**Сельсоветы:** Буйновіцкі, Замошскі, Астрожанскі Лельчыцкага раёна, Махновіцкі Ельскага раёна, Снядзінскі, Глініцкі і Асавецкі Петрыкаўскага раёна.

*215. ЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Ельск).*

**Сельсоветы:** Ельскі, Кузьміцкі, Роза-Люксембургскі, Мелешкаўскі, Качышчанскі, Рэмязоўскі, Багуцікі і Санюкоўскі Ельскага раёна.

*216. МОЗЫРСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Мозыр).*

**Сельсоветы:** Бібікоўскі, Юравіцкі, Бярозаўскі, Крышыцкі, Гулевіцкі, Малааўцюкоўскі і Вялікааўцюкоўскі Мозырскага раёна.

*217. СЛАБАДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Мозыр).*

**Сельсоветы:** Казіміраўскі, Слабодскі, Клінскі, Прудокскі, Каменскі, Баброўскі, Бабраняцкі і Калінкавіцкі Мозырскага раёна.

*218. КАЛІНКАВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Калінкавічы).*

**Горад Калінкавічы і сельсоветы:** Якімавіцкі, Антонаўскі, Дудзіцкі Мозырскага раёна і Сухавіцкі Даманавіцкага раёна.

*219. МОЗЫРСКАЯ ГАРАДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Мозыр).*

Горад Мозыр.

*220. ДУБРОЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — в Васілевічы).*

**Сельсоветы:** Сведскі, Узнажскі, Дуброўскі, Какуевіцкі, Залатушскі, Зеляноцкі і Нахаўскі Васілевіцкага раёна.

*221. ВАСІЛЕВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — в. Васілевічы).*

**Сельсоветы:** Васілевіцкі, Бабініцкі, Ліскоўскі, Караваціцкі, Кабылеўскі, Маканавіцкі і Хатнянскі Васілевіцкага раёна.

*222. ХОЙНІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Хойнікі).*

**Хойніцкі местачковы совет і сельсоветы:** Забалоцкі, Небытоўскі, Дварышчанскі, Алексіцкі, Загальскі і Барысаўшчанскі Хойніцкага раёна.

*223. ПАСЕЛІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Хойнікі).*

**Сельсоветы:** Паселіцкі, Валокскі, Вяліка-Борскі, Корчаўскі, Маладушскі, Амелькаўскі Хойніцкага раёна і Мікуліцкі Брагінскага раёна.

(ПРАЦЯГ ГЛ. НА 4-ай СТАР.).

# АБ ВЫБАРЧЫХ АКРУГАХ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР

## *Працяг пастановы Прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР*

*224. СТРЭЛІЧЭЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — в. Стрэлічаў).*

**Сельсоветы:** Стрэлічэўскі, Бабчынскі, Новасёлкаўскі, Тульговіцкі, Кажушкаўскі, Арэвіцкі, Рудакоўскі Хойніцкага раёна, Баршчоўскі і Радзінскі Камарынскага раёна.

*225. БРАГІНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Брагін).*

**Брагінскі местачковы совет і сельсоветы:** Шкуратоўскі, Маложынскі, Малейкаўскі, Крыўчанскі, Лубяніцкі і Буркоўскі Брагінскага раёна.

*226. БРАГІНСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Брагін).*

**Сельсоветы:** Астраглядаўскі, Глухавіцкі, Хракавіцкі, Савіцкі, Выгрэбна-Слабодскі і Сперыжскі Брагінскага раёна.

*227. НАРАЎЛЯНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Нароўля).*

**Нараўлянскі местачковы совет і сельсоветы:** Міхалкаўскі, Барбараўскі, Нараўлянскі, Галоўчыцкі і Дземідаўскі Нараўлянскага раёна.

*228. НАРАЎЛЯНСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Нароўля).*

**Сельсоветы:** Вербавіцкі, Углоўскі, Акопскі, Бярозаўскі, Доўлядаўскі, Дзернавіцкі, Цешкаўскі, Хаткоўскі, Мохаедаўскі і Красноўскі Нараўлянскага раёна.

*229. КАМАРЫНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Камарын).*

**Сельсоветы:** Ніжне-Жараўскі, Чыкаловіцкі, Асарэвіцкі, Гдзеніскі, Капоранскі, Калыбанскі, Новаіолчанскі, Лукаедаўскі, Верхне-Жараўскі, Піркаўскі, Крукоўскі, Камарынскі і Спепанаўскі Камарынскага раёна.

## ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

*230. ЖУРАВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Журавічы).*

**Журавіцкі местачковы совет і сельсоветы:** Селецкі, Ісканскі, Баханскі, В. Зімніцкі, Хатаўнянскі і Рэкцянскі Журавіцкага раёна.

*231. ДОЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — в. Доўск).*

**Сельсоветы:** Доўскі, Курганскі, Свержанскі, Званецкі, Балатнянскі і Абідавіцкі Журавіцкага раёна.

*232. КАРМЯНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Карма).*

**Сельсоветы:** Вараноўскі, Струкачэўскі, Боравабудскі, Каропькаўскі, Хівоўскі, Задубскі, Барсукоўскі і Курахоўшчынскі Кармянскага раёна.

*233. КАРМЯНСКА - ЛІТВІНАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Карма).*

**Кармянскі местачковы совет і сельсоветы:** Курганіцкі, Бычанскі, Рудняскі, Літвінаўскі, Хлеўнянскі, Валынцаўскі і Струменскі Кармянскага раёна.

*234. РАГАЧОЎСКАЯ ГАРАДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Рагачоў).*

**Горад Рагачоў і сельсоветы:** Збароўскі, Мадорскі і Кісценеўскі Рагачоўскага раёна.

*235. ГАРАДЗЕЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Гарадзец).*

**Сельсоветы:** Гарадзецкі, Вішанскі, Свяцкі, Сталпнянскі, Мала-Стралкаўскі, Гадзілавіцкі Рагачоўскага раёна і Майскі Жлобінскага раёна.

*236. ЦІХІНІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Ціхінічы).*

**Сельсоветы:** Ціхініцкі, Крушынаўскі, Азеранскі, Запольскі, Старасельскі і Станькаўскі Рагачоўскага раёна.

*237. РАГАЧОЎСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Рагачоў).*

**Сельсоветы:** Побалаўскі, Забалоцкі, Дварэцкі, Лучынскі Рагачоўскага раёна і Бабоўскі Жлобінскага раёна.

*238. ЖЛОБІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Жлобін).*

Горад Жлобін.

*239. ЖЛОБІНСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Жлобін).*

**Сельсоветы:** Салонскі, Окцябрскі, Затонскі, Чатвернянскі, Пірэвіцкі, Скепнянскі, Мормальскі і Стара-Руднянскі Жлобінскага раёна.

*240. СТРЭШЫНСКАЯ ВЫБАРБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Стрэшын).*

**Стрэшынскі нацыянальны совет і сельсоветы:** Стрэшынскі, Верхне-Албянскі, Нова-Маркаўскі, Папаратнянскі, Добрагошчанскі і Кабанаўскі Жлобінскага раёна.

*241. ЧЫРВОНАБЯРЭЖСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—г. Жлобін).*

**Сельсоветы:** Чырвонабярэжскі, Лукаўскі, Малевіцкі, Казіміраўскі, Каротказўскі і Радужскі Жлобінскага раёна.

*242. ЧАЧЭРСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Чачэрск).*

**Чачэрскі местачковы совет і сельсоветы:** Меркулавіцкі, Глыбочыцкі, Матневіцкі, Аторскі Чачэрскага раёна і Расохскі Кармянскага раёна.

*243. ЧАЧЭРСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Чачэрск).*

**Сельсоветы:** Ленінскі, Нова-Зарэчанскі, Дудзіцкі, Халочскі, Наўхоўскі, Раўковіцкі, Нова-Малыніцкі, Залескі, Бяляеўскі, Закрынічны і Р. Барталамееўскі Чачэрскага раёна.

*244. СВЯЦІЛАВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — в. Свяцілавічы).*

**Сельсоветы:** Свяцілавіцкі, Жалезніцкі, Неглюбскі, Мала-Немкаўскі, Янаўскі, Сталбунскі, Казапка-Балсунскі, Вяліка-Немкаўскі і Рудня-Сталбунскі Свяцілавіцкага раёна.

*245. ПАКОЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — в. Пакоць).*

**Сельсоветы:** Пакоцкі, Бабіцкі, Рэчкаўскі, Хізоўскі, Рудня-Шлягінскі, Акшынскі, Навілаўскі, Ухаўскі Свяцілавіцкага раёна, Нісімкавіцкі, Будзішчанскі і Палескі Чачэрскага раёна.

*246. ВЕТКАЎСКАЯ ГАРАДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Ветка).*

**Горад Ветка і сельсоветы:** Бяседскі, Барталамееўскі, Сівенскі, Нова-Грамыпкі, Стара-Закружскі, Калінінскі і Тарасаўскі Веткаўскага раёна.

*247. ВЕТКАЎСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Ветка).*

**Сельсоветы:** Данілавіцкі, Прыснянскі, Шарсцінскі, Радужскі, Хальчанскі, Старасельскі і Рудня-Споніцкі Веткаўскага раёна.

*248. БУДАКАШАЛЕЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр—м. Буда-Кашалеўская).*

**Сельсоветы:** Будакашалеўскі, Патапаўскі, Кашалеўскі, Забабскі, Дуравіцкі, Губіцкі і Недайскі Будакашалеўскага раёна.

*249. БУДАКАШАЛЕЎСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — Буда-Кашалеўская).*

**Сельсоветы:** Рагінскі, Забалоцкі, Ліпніцкі, Прыборскі, Буда-Люшаўскі і Любавінскі Будакашалеўскага раёна.

*250. УВАРАВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Уваравічы).*

**Сельсоветы:** Ліпскі, Сталінскі, Лапіцкі, Блюдніцкі, Рудзянецкі, Калінінскі, Аздзелінскі і Уваравіцкі Уваравіцкага раёна.

*251. УВАРАВІЦКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Уваравічы).*

**Сельсоветы:** Смычкоўскі, Чабатовіцкі, Крыўскі, Івольскі, Бацунскі, Цырэніцкі, Глазаўскі, Гусевіцкі, Пенчынскі і Стара-Беліцкі Уваравіцкага раёна.

*252. ЗАСПЕНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — в. Заспа).*

**Сельсоветы:** Заспенскі, Холмецкі, Баршчоўскі, Артукоўскі, Сямёнаўскі і Свірыдавіцкі Рэчыцкага раёна.

*253. РОВЕНСКА-СЛАБОДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — в. Ровена Слабада).*

**Сельсоветы:** Ровена-Слабодскі, Беззуеўскі, Перасвятаўскі, Капараўскі, Дзехаўскі, Нова-Барсуцкі і Вышамірскі Рэчыцкага раёна.

*254. РЭЧЫЦКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Рэчыца)*

**Сельсоветы:** Горвальскі, Падалескі, Дзюрдзеўскі, Валадарскі, Чарнянскі, Азершчынскі Рэчыцкага раёна, Бярвенаўскі, Борхаўскі і Целяшкоўскі Уваравіцкага раёна.

*255. РЭЧЫЦКАЯ ГАРАДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Рэчыца, Дом саюзаў).*

**У граніцах** — рака Ведрыч, рака Днепр, вуліцы: Карла Маркса, Ленінская, Кулікоўская, Першая Палявая, Чапаева да чыгункі і Копаньскі сельсовет Рэчыцкага раёна.

*256. РЭЧЫЦКАЯ ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Рэчыца, Дом саюзаў).*

**У граніцах — па вуліцах:** Чапаева, Першая Палявая, Кулікоўская, Ленінская, Карла Маркса, рака Днепр і Жмуроўскі сельсовет Рэчыцкага раёна.

*257. УРЫЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. ГОМЕЛЬ).*

**Сельсоветы:** Касцюкоўскі, Яромінскі, Пакалюбіцкі, Прудкоўскі, Урыцкі, Прыборскі і Мільчанскі Гомельскага раёна.

*258. ГОМЕЛЬСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. ГОМЕЛЬ).*

**Сельсоветы:** Ціценскі, Рамановіцкі, Давыдаўскі, Бабовіцкі, Жэробінскі, Міхалькоўскі, Дзятлавіцкі, Жарналіцкі і Улукаўскі Гомельскага раёна.

*259. КЛІМАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Гомель).*

**Сельсоветы:** Сеўрукоўскі, Клімаўскі, Забраўскі, Прыбыткоўскі, Цярэшкавіцкі Гомельскага раёна, Насовіцкі, Церухскі і Пясочна-Будскі Цэрахоўскага раёна.

*260. ГОМЕЛЬСКАЯ СТАЛІНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Гомель, камбінат «Спартак»).*

**У граніцах — па вуліцах:** Першая Красная, Савецкая, Піонерская, рака Сож, пасёлкі «Касцюкоўка» і «Чырвоны Кастрычнік».

*261. ГОМЕЛЬСКАЯ ЛЕНІНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Гомель, Аўтатэхнікум).*

**У граніцах — па вуліцах:** Першая Красная, лінія чыгункі, Вакзальная, Карповіча, Леніна, Совецкая, парк піонераў, Пушкінская, Парыжскай Камуны, Садовая, Арцёма, рака Сож, Піонерская, Совецкая, Першая Красная.

*262. ГОМЕЛЬСКАЯ ДЗЕРЖЫНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Гомель, клуб фабрыкі «Праца»).*

**У граніцах — па вуліцах:** Арцёма, Садовая, Парыжскай Комуны, Пушкінская, парк піонераў, Леніна, Карповіча, Комсамольская, Каляева, Сялянская, Кааперацыйная, Інтэрнацыянальная, Комсамольская, рака Сож.

*263. ГОМЕЛЬСКАЯ КІРАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Гомель, клуб швейнікаў).*

**У граніцах — па вуліцах:** лінія чыгункі, Сенная, Нова-Сталярная, Ветраная, Інтэрнацыянальная, 2-гі Інтэрнацыянальны зав., Спартак, Пролетарская, Комсамольская, Інтэрнацыянальная, Кааперацыйная, Сялянская, Каляева, Комсамольская, Карповіча, лінія чыгункі.

*264. ГОМЕЛЬСКАЯ КАГАНОВІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр— г. Гомель, завод Сельмаш).*

**У граніцах — па вуліцах:** раён Сельмаша, Новікаўская рошча, лінія чыгункі, Ауэрбаха, Батарэйная, Одэская, Спартыўная, Ауэрбаха, Заходняя, Варашылаў., Мільчанская.

*265. ГОМЕЛЬСКАЯ ВАРАШЫЛАЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр —г. Гомель, база Белкаапсаюза).*

**У граніцах — па вуліцах:** Быхаўская, Слепнёва, Пескаватая, Льва Талстога, лінія чыгункі, Ауэрбаха, Батарэйная, Одэская, Спартыўная, Ауэрбаха, Заходняя, Варашылава, Мільчанская.

*266. ГОМЕЛЬСКАЯ ФРУНЗЕНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Гомель, Навукова-даследчы інстытут).*

**У граніцах — па вуліцах:** Быхаўская, Слепнёва, Пескаватая, Льва Талстога, лінія чыгункі, Сенная, Нова-Сталярная, Ветраная, Інтэрнацыянальная, 2-гі Інтэрнацыянальны зав., Спартак, Пролетарская, парк, рака Сож, соўгас «Пяскі», паўночная частка Нова-Беліцы ў граніцах — па вуліцах: 11 Ліпеня, лінія чыгункі.

*267. НОВА-БЕЛІЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — Нова-Беліца).*

**Нова-Беліца** за выключэннем паўночнай часткі, уваходзячай у Гомельскую Фрунзенскую выбарчую акругу.

*268. ДОБРУШСКАЯ ГАРАДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Добруш).*

**Горад Добруш і сельсоветы:** мар'інскі, Жгуна-Будскі, Дземянкаўскі і Ачэса-Руднянскі Добрушскага раёна.

*269. ДОБРУШСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — г. Добруш).*

**Сельсоветы:** Харошаўскі, Агародне-Гомельскі, Кармянскі, Перарастаўскі, Крупецкі і Жгунскі Добрушскага раёна.

*270. ЛЕНІНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Цэрахоўка).*

**Сельсоветы:** Ленінскі, Дуброўскі, Васільеўскі, Баршчоўскі, Кузьмініцкі, Усоха-Будскі і Кругавец-Калінінскі Цэрахоўскага раёна.

*271. ЦЭРАХОЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Цэрахоўка).*

**Сельсоветы:** Цэрахоўскі, Пракопаўскі, Маркавіцкі, Падабранскі, Глыбоцкі, Уцёўскі, Гардуноўскі, Краўцоўскі і Грабаўскі Цэрахоўскага раёна.

*272. ЛОЕЎСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Лоеў).*

**Сельсоветы:** Лоеўскі, Казярожскі, Карпаўскі, Рудне-Марымонаўскі, Першамайскі, Шарпілаўскі, Перадзельскі і Крупейскі Лоеўскага раёна.

*273. ЛОЕЎСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА (цэнтр — м. Лоеў).*

**Сельсоветы:** Ручаеўскі, Дзяражыцкі, Бывалькоўскі, Баршчоўскі, Хаткоўскі, Уборкаўскі, Ліпнякоўскі і Старадубскі Лоеўскага раёна.

*Вык. аб. старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.*

*Вык. аб. сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЕРМАК.*

21 красавіка 1938 г.
гор. Менск.

# СТВАРЭННЕ ОПЕРЫ „ДРЫГВА"

**А. БАГАТЫРОЎ**



Думка напісаць оперу па матывах аповесці Якуба Коласа «Дрыгва» з'явілася ў мяне некалькі год назад. Але ажыццявіць гэту задачу мне ўдалося толькі ў сучасны момант. Адной з прычын зацяжкі была адсутнасць лібрэта. Але ў чэрвені 1937 года лібрэта (першая рэдакцыя) было гатова. З аўтарам лібрэта тав. Рамановічам мы прыступілі да яго канчатковай апрацоўкі. К жніўню 1937 года я меў ужо тэкст першага акта і з другой паловы месяца прыступіў да напісання музыкі. Да 15 верасня першы акт быў закончан. Я прадэманстрыраваў яго ў Тэатры оперы і балета, і ён быў прыняты.

Пасля гэтага я прыступіў да другога акта. У работу над маёй операй уключыліся галоўны рэжысёр Смоліч і дырыжор Акулаў, якія мне шмат у чым дапамаглі. Рэзультатам гэтай работы з'явілася закончэнне мною клавіра оперы.

Асноўная тэма оперы «Дрыгва» — барацьба беларускага народа сумесна з Чырвонай Арміяй супроць белапольскіх інтэрвентаў у 1920 годзе.

Дзея адбываецца ў глушы Палесся. Пачынаецца дзея ў святочны дзень у вёсцы каля лесу. Настрой цяжкі, бо мясцовасць акупіравана белапалякамі. На сцэне — дзед Тарас, якога абкружаюць дзеці, Васіль Бусыга — кулак, яго жонка Аўгіння і народ. Паяўляецца Кузьміч — большэвік, падпольшчык, які шукае Андрэя, сына дзеда Тараса. Андрэй таксама большэвік і працуе з Кузьмічом у тылу ў белапалякаў па арганізацыі партызанскіх атрадаў.

Адбываецца кароткая гутарка Андрэя з Кузьмічом, які дае яму лістоўкі. Гэта бачыць Бусыга. Паяўляецца Аўгіння, жанчына з моцным характарам, якая любіць не мужа, а Андрэя і думае аб ім.

Раздаецца гук трубы — атрад белапалякаў ідзе за фуражом. З усіх бакоў збягаецца народ, які пратэстуе супроць гвалту. Нечакана Тарас выхоплівае ў легіянера вінтоўку, б'е паручыка Вітольда і кідаецца ўцякаць у лес. Гэта—змест першага акта.

Пан напалохан тым, што дзед Тарас сумесна з Кузьмічом арганізавалі партызанскі атрад і наводзяць паніку на белапалякаў. Трэба знайсці спосаб адшукаць прытулак партызанаў і там знішчыць іх. Бусыга вырашае выкарыстаць Саўку ў якасці правакатара. Саўка згодны за грошы і гарэлку на ўсё. План такі: Саўка вызваляе Андрэя, бяжыць з ім у лес да партызанаў, быццам-бы далучаецца да іх, а потым вяртаецца і вядзе туды белапалякаў.

Першая частка плана ўдаецца. Саўка вызваляе Андрэя і бяжыць з ім у лес. У наступным акце (трэцім) — партызанскі стан. Кузьміч прапануе Тарасу план злучэння з Чырвонай Арміяй, каб разам разграміць белапалякаў. Ён сам бярэцца прайсці фронт. Тарас згаджаецца.

Далей следуе сустрэча Андрэя з Тарасам і партызанамі. Андрэй раскрывае здрадніцтва Саўкі. Усе здзіўлены і хочуць учыніць над Саўкам самасуд. Андрэй загадвае ўзяць яго пад варту. У часе фінальнай песні з пляскамі Саўка ўцякае.

Апошні (чацверты) акт паказвае зварот Саўкі і адпраўленне белапалякаў на партызанаў. Аўгіння, бачачы здрадніцтва бацькі, вырашае канчаткова парваць з ім і з мужам і бяжыць да партызанаў, каб папярэдзіць іх аб пагражаючай небяспецы.

Партызаны ідуць, каб дапамагчы Чырвонай Арміі перабрацца праз дрыгву. У якасці вартавога застаецца адзін Андрэй. Праз некаторы час з'яўляецца Аўгіння. Андрэй пасылае яе папярэдзіць партызанаў аб небяспецы, а сам будуе ўяўную засаду і хаваецца ў дупло. Прыходзяць белапалякі. Андрэй спрабуе затрымаць іх і гіне. У гэты час Чырвоная Армія перапраўілася і разам з партызанамі нападае на белапалякаў і знішчае іх. Заканчваецца опера хорам. Партызаны клянуцца адпомсціць за Андрэя. Чырвоная Армія з песняй аб Варашылаве ідзе ў далейшае наступленне.

У оперы я імкнуўся да таго, каб усе мае тэмы былі блізкімі да народнага беларускага мелосу і каб уся музыка оперы была праніктута народным беларускім каларытам. Ад аповесці Я. Коласа «Дрыгва» мне і лебрэтысту тав. Рамановічу прышлося ў радзе момантаў адыйсці, каб узмацніць драматургічную і сюжэтную лінію.

Працуючы над операй, я імкнуўся вылучыць на першае месца вакальную лінію з тым, каб даць актору магчымасць больш співаць, што з'яўляецца найважнейшым у оперы.

Зараз опера ў клавіры закончана. Я прыступіў да аркестроўкі. Але да гэтага часу не ведаю, калі опера будзе пастаўлена, хто будзе ставіць яе і хто будзе дырыжыраваць, бо ні дырыжора, ні рэжысёра пакуль яшчэ няма. Дырэкцыя Опернага тэатра і Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР праяўляюць паўнейшую абыякавасць і безадказнасць у справе стварэння першых беларускіх совецкіх опер. У тэатры вялікі недахоп вядучых салістаў, — напрыклад, зусім адсутнічае драматычны тэнар, а ў совецкіх операх гэты голас займае вядучае становішча. Планавасці ў рабоце тэатра няма. Няма галоўнага рэжысёра і галоўнага дырыжора, а без іх не можа быць сапраўднай творчай работы. У рэзультаце тэатр у гэтым сезоне за дзевяць месяцаў работы не стварыў ні адной новай пастаноўкі. Я лічу, што такому становішчу трэба паклaсці канец, бо гэта вядзе да зрыву і наступнага сезона — сезона 1938-39 года.

Упраўленню па справах мастацтваў і дырэкцыі Опернага тэатра час ужо шчыльна падыйсці да ажыццяўлення пастановак першых беларускіх опер і балетаў.

# Мастацкая самадзейнасць у Веткаўскім раёне

Мастацкая самадзейнасць працоўных расце і пашыраецца з кожным годам. Гэта ўжо не «забава ад нечага рабіць», а частка быту працоўных, адна з форм праяўлення іх актыўнасці.

Па Веткаўскаму раёну налічваецца 95 гурткоў самадзейнасці, у тым ліку 29 харавых гурткоў, 18 драматычных, 23 музыкальных і інш., якія аб'ядноўваюць звыш тысячы ўдзельнікаў.

Толькі на раённай алімпіядзе мастацкай самадзейнасці, якая праводзілася ў канцы 1937 года, удзельнічала звыш 400 чалавек.

У справе арганізацыі мастацкай самадзейнасці, асабліва ў калгасах, вялікая роля належыць настаўнікам. І арганізацыя гуртка і поспехі яго работы часта залежаць ад наяўнасці здольнага настаўніка, жадаючага кіраваць харавым, драматычным гуртком. Напрыклад, драмгуртком у калгасе «Чырвоны Кастрычнік» кіруе настаўніца тав. **Езерская.** У калгасе імя Варашылава драматычным гуртком кіруе настаўніца тав. **Якушкіна,** а харавым—тав. **Левітан.** У калгасе імя Фрунзе харавым гуртком кіруе настаўніца тав. **Грамыка Наташа.**

Такіх прыкладаў можна было-б прывесці шмат. Аднак, было-б няправільна сцвярджаць, што толькі настаўнікі кіруюць і могуць кіраваць гурткамі мастацкай самадзейнасці. Кіруюць гурткамі і калгаснікі, і вучні (тав. **Фіцэва**—калгас імя М. Горкага, тав. **Ліўшыц**—ткацкая арцель і інш.).

Сумныя былі спевы селяніна ў часы царызма. У наступнай, поўнай іроніі песеньцы давалася тлумачэнне гэтага:

> Цар Мікалай прыслаў маніфест:
> Мёртвым—свабоду, жывых пад арэст...

Спевы пра «парадак у хаце», дзе «дзіцятка ў люльцы як бычок равець», пра няшчасную долю жаночую, пра панскія знявагі, пра долю батрацкую—вось змест народнай лірыкі дарэвалюцыйнай вёскі.

Знікла назаўсёды кашмарнае мінулае. Сумныя спевы, поўныя журбы, саступілі месца спевам радасным і бадзёрым.

Спевы пра друга, настаўніка і правадыра таварыша Сталіна, пра яго бліжэйшых саратнікаў, пра Чырвоную Армію, пра слаўных пагранічнікаў, пра калгасны лад, спевы працы і змагання—вось аб чым спявае зараз калгасная вёска.

Ці ўсё ўжо зроблена ў справе мастацкай самадзейнасці? Не, далёка не ўсё.

Музыкальныя і драматычныя гурткі слаба забяспечаны інструментамі, грымам, касцюмамі. Нехапае п'ес, асабліва прыстасаваных да пастаноўкі ў калгасных клубах і чырвоных кутках.

РайАНА, палітасветустановы, комсамольскія арганізацыі яшчэ мала цікавяцца мастацкай самадзейнасцю мас.

Ліквідацыя гэтых недахопаў значна павялічыць поспехі мастацкай самадзейнасці.

**І. П. КОЖАР.**
**Сакратар Веткаўскага РК КП(б)Б.**

# КАНЦЭРТ КАМПАЗІТАРА В. А. ЗАЛАТАРОВА

14 красавіка адбыўся радыёканцэрт вядомага беларускага кампазітара прафесара В. А. Залатарова. У канцэрце была прадстаўлена сімфанічная і вакальная творчасць кампазітара ў выкананні сімфанічнага аркестра Філармоніі (дырыжор Мусін) і салістаў Тэатра оперы і балета Н. Сімаго і Л. Г. Адамантавай.

Галоўным творам канцэрта з'явілася сімфонія № 1, — першы буйны твор кампазітара, напісаны ім адразу пасля еканчэння б. Пецербургскай кансерваторыі ў 1901 годзе. Змест сімфоніі звязан з падзеямі жыцця кампазітара ў той перыяд.

Маладога, поўнага творчых сіл музыканта, які імкнуўся ўвасобіць у сваёй музыцы вялікія, высокія ідэалы, сустрэла змрочная, затхлая атмасфера дарэвалюцыйнага грамадства Расіі. Цяжкае матэрыяльнае становішча, непадзейнасць багатых апекуноў, непавага да чалавечай годнасці мастака, неабходнасць прыстасавання—і ярасны пратэст супроць гэтага, бегства ў прыроду, суцяшэнне ў ёй,—вось тая старонка з асабістага дзённіка кампазітара, у якой трэба шукаць ключ да разумення музыкальнага зместу сімфоніі.

Пачынаецца сімфонія кароткім кантрасным уступам, які мае ў сабе зародак будучага тэматычнага матэрыялу. Дзве тэмы першай часткі — волевая, напорыстая, энергічна рытмаваная, «пратэстуючая» першая тэма і напеўная, сумная другая тэма рэзка кантрасны адна другой. Дынамічнае развіццё музыкальнага матэрыялу дасягае найбольшага драматызма ў рэпрызе. Моманты «знікання», спаду чаргуюцца з настойлівымі, упартымі рытмамі тэмы «пратэсту», і заканчваецца гэта частка энергічным, магутным канцом, ударамі ўсяго аркестра, сцвярджаючым урачыстасць тэмы барацьбы.

Другая частка —, грацыёзная, празрыстая скерца. Гэта шумы і шэлесты прыроды, — вечна цудоўны матэрыял жывога — ва ўлонні якой шукае прытулку кампазітар. Адлалёныя харальныя гучанні, якімі кампазітар характарызуе руціну і коснасць абкружаючай яго рэчаіснасці, не могуць засланіць асноўнага характару музыкі.

Наступная частка — андантэ — чаруючы пейзаж, акварэльны малюнак цёплага летняга вечара, на фоне якога гучыць просты і задумлівы пастушы найгрыш. Трывожныя рытмы мяцежнай тэмы пратэсту, імкнучыся ўварвацца ў гэту частку, згладжваюцца, рашчыняюцца ў яе агульным фоне і зліваюцца з пявучай мелодыяй рожка.

У фінале сімфоніі зноў узнікае трагічны канфлікт першай часткі. Тут барацьба праходзіць яшчэ больш абвострана, але ўсё ярчэй гучыць імклівая, страсная асноўная тэма, і магутныя выбухі ўсяго аркестра заканчваюць сімфонію.

Музыкальная мова кампазітара ў гэтай сімфоніі, хоць і не зусім яшчэ самастойная (адчуваецца ўплыў Чайкоўскага), — багатая і шчырая. Мелодыі простыя, натуральныя і глыбока выразныя. Аркестроўка насычаная, рознастайная і кантрасная.

Акрамя сімфоніі, у канцэрце выконваліся «Рапсодыя на яўрэйскія тэмы» — бліскучы аркестравы твор і «Хараводная», якая пакінула некалькі меншае ўражанне.

Па-майстэрску зробленыя апрацоўкі беларускіх народных песень былі выразна і з густам выкананы артыстамі Сімаго і Адамантавай.

Аркестр Філармоніі пад кіраўніцтвам дырыжора Мусіна добра справіўся з сваёй задачай.

**Ал. КАРПОВІЧ.**

# НАД ЧЫМ МЫ ПРАЦУЕМ

## ГАЛОЎНЫ БАЛЕТМЕЙСТАР ТЭАТРА ОПЕРЫ І БАЛЕТА К. МУЛЕР

У рэпертуар новага Вялікага тэатра оперы і балета на 1938 год уключаны тры балеты: **«Бахчысарайскі фантан»** (музыка **Асаф'ева**) у пастаноўцы балетмейстара **Н. Я. Галейзоўскага, «Лебядзінае возера»** (музыка **Чайкоўскага**) і **«Салавей»** (музыка **Крошнера**) у маёй пастаноўцы.

Балет «Лебядзінае возера» з'яўляецца адным з лепшых узораў класічнага балета. У аснову балета пакладзена старажытная сярэдневяковая легенда, ідэя якой з'яўляецца барацьба дабра і зла. Музыка, напісаная для гэтага балета Чайкоўскім, вельмі прыгожая, свежая, насычана драматургічным зместам, зручна па сваёй форме для пабудовы балетнага спектакля і адначасова з'яўляецца сімфанічнай.

Другі балет «Салавей», музыка Крошнера, над якім я зараз працую, гэта першы беларускі балет. Спектакль вельмі складаны. Тут трэба добра ведаць беларускі фальклор, гісторыю беларускага народа. На сцэне дзейнічаюць жывыя людзі, а не казачныя лебедзі — рамантычнае адлюстраванне дзяўчат. Героі гэтага балета — прыгонныя сяляне, якія змагаюцца са сваім панам і панскімі гайдукамі. Нянавісць да паноў яднае сялян. Асабістая драма героя — драма ўсяго прыгоннага сялянства. Яны шукаюць выйсця ў сваёй нянавісці да прыгнятальнікаў і знаходзяць яго ў паўстанні. Задача балетмейстара вельмі складаная. Трэба знайсці рухі, якія дапамаглі-б артысту раскрыць неабходны вобраз і каб адначасова гэтыя рухі былі праўдзівыя і пераканаўчыя. Задача складаная і я лічу для сябе вялікім гонарам выканаць яе.

## САЛІСТКА ТЭАТРА ОПЕРЫ І БАЛЕТА З. А. ВАСІЛЬЕВА

Да адкрыцця Тэатра оперы і балета я падрыхтавала два балеты: «Лебядзінае возера» (музыка Чайкоўскага) і «Бахчысарайскі фантан» (музыка Асаф'ева). Зараз я пачынаю працаваць над трэцім балетам — «Салавей» паводле аповесці Змітрака Бядулі, музыка Крошнера, у пастаноўцы Мулера.

Працуючы над вобразамі гэтых балетаў, я вывучаю эпоху, у якой разгортваецца сюжэтная лінія спектакля, і імкнуся ўскрыць сутнасць таго ці іншага вобраза і ярчэй перадаць яго сродкамі харэаграфіі.

У балеце «Лебядзінае возера» я выконваю дзве ролі. У ролі Одэты я павінна перадаць у вобразе рамантычнага Лебедзя лёс дзяўчыны XVI стагоддзя, прыгнечанай умовамі той эпохі.

У наступным акце з ролі лірычнага Лебедзя я пераключаюся на ролю Одыліі. Яна дачка багатага калдуна, не жаданням няма перашкод.

У балеце «Бахчысарайскі фантан» паводле Пушкіна я выконваю ролю Марыі.

Але самай адказнай і цяжкай для балетнага мастацтва з'яўляецца роля Зосі ў балеце «Салавей». Гэта—прыгонная дзяўчына, якая ў сваіх перажываннях даходзіць да вар'яцтва. «Салавей» з'яўляецца першым нацыянальным беларускім балетам. Адказная задача заключаецца ў абсалютна правільнай трактоўцы вобразаў. Для гэтага я еду ў калгас, каб пазнаёміцца з бытам калгаснікаў БССР, вывучыць іх звычаі і характэрныя рысы — і ўсё гэта ўкласці ў вобраз Зосі ў балеце «Салавей».

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела К—5502